FORUM NUMIZMATYCZNE

Studia i Materiały
№ 4

Pod redakcją naukową
Krzysztofa Filipowa

Białystok 2020

Rada Redakcyjna:
Aleksandr Bugrov (Rosja), Krzysztof Filipow (Polska)
Ēriks Jēkabsons (Łotwa), Wiktor Kakareko (Białoruś)
Valerij Kapeliusznij (Ukraina), Maciej Karczewski (Polska)
Viktor Kotzur (Ukraina), Vasyl Orlyk (Ukraina)
Stefan Samoila (Rumunia), Andrzej Suchcitz (Anglia), Zbyšek Šustek (Słowacja)

Kolegium Redakcyjne:
Redaktor Naczelny: Krzysztof Filipow
Sekretarz Redakcji: Barbara Kuklik

Recenzenci:
Prof. dr hab. Valerij Lastovsky (Ukraina)
Narodowy Uniwersytet Kultury i Sztuki w Kijowie
Prof. dr hab. Antoni Mironowicz
Uniwersytet w Białymstoku

Seria: Forum Numizmatyczne

Redakcja Naukowa: Krzysztof Filipow

Korekta: Zespół i Autorzy

Projekt okładki i opracowanie techniczne: Barbara Kuklik

Tłumaczenia: Autorzy i Krzysztof Filipow

Foto na okładce: skarb monet z Jelny, rej. Szczuczyn (s. 43)

Publikacja dofinansowana
przez Wydział Historii i Stosunków Międzynarodowych

Wszelkie prawa zastrzeżone
Żadna część tej publikacji nie może być reprodukowana i wykorzystywana
w jakiejkolwiek postaci i formie bez wyrażenia pisemnej zgody wydawcy

Wydawca: Ośrodek Badań Europy Środkowo-Wschodniej

ISBN 978-83-950711-8-8
ISSN 0208-0710

Nakład: 100 egzemplarzy
Copyright by Autorzy i Ośrodek Badań Europy Środkowo-Wschodniej
Białystok 2020

Андрэй Карач
ORCID: 0000-0001-9034-5835
(Беларсуь)

ПРАЦАЎНІКІ ВІЛЕНСКАГА МАНЕТНАГА ДВАРА Ў ЧАСЫ АЛЯКСАНДРА (1492-1506)

З уступленнем на вялікакняскі пасад Аляксандра ў 1492 г. у Літве пачаўся новы перыяд у развіцці дзяржавы – гэта пераходны этап ад Сярэднявечча да Новага часу. Малады і амбітны новы Вялікі князь актыўна ўзяўся за дзяржаўныя справы. Вялікую ўвагу надаваў развіццю гарадоў і мястэчак, стварэнню новых местаў. Не менш за 49 з іх атрымалі ад Вялікага князя розныя прывілеі. Ён актыўна праводзіў урбанізацыйную палітыку і дбаў аб развіцці лакальных рынкаў. Усё гэта мела мэтай толькі адно – хутчэйшае папаўненне скарбу краіны, які ва ўмовах ваенных сутычак з Маскоўскай дзяржавай аказаўся поўнасцю спустошаным, а падаткі, якія шлі з местаў займалі значную частку ў гэтай справе [1, с. 18-33]. Пачалося актыўнае наданне ім магдэбургскага права, што садзейнічала іх актыўнаму развіццю [2, с. 8; 3, с. 290-291; 4, с. 83-84, 153-154; 5, с. 59-61; 6, с. 30-31; 7, с. 579-580].

Важную ролю надаваў Аляксандр і сталіцы, у якой ён праводзіў большасць часу. Жадаючы быць побач з Вялікім князем, сюды пацягнуліся магнаты і шляхта – гэта выклікала даволі вялікі прыток насельніцтва. Аляксандр, нават, абмежаваў куплю-продаж дамоў у Вільні [8, с. 59-60].

Адраджэннем манетнай чаканкі Вялікага княства Літоўскага стала грашовая рэформа, праведзеная Вялікім князем Аляксандрам Казіміравічам у 90-х гг. XV ст. Пасля доўгага перапынку ўзнавіла працу Віленская мынца, дзе пачаўся выпуск уласнай манеты ВКЛ – літоўскіх паўгрошаў і пенязяў (дэнарыяў). На змену састарэлым сярэднявечным тэхналогіям манетнай вытворчасці прыйшлі перадавыя еўрапейскія методыкі, заснаваныя на найноўшых дасягненнях таго часу ў манетнай справе, што дазволіла дасягнуць якасна новага ўзроўню чаканкі і стварыць прынцыпова новую грашовую сістэму краіны, заснаваную на ўласным літоўскім лічыльным грошы [9, с. 117].

Стварэнне асабістай моцнай еўрапейскай грашовай сістэмы было адным з важнейшых фактараў, якія паўплывалі на далейшую інтэграцыю ВКЛ у Еўропу [10, с. 19].

Да сённяшняга часу застаецца дастаткова спрэчным пытанне аб пачатку эмісійнай дзейнасці Віленскай мынцы ў часы Аляксандра. Шэраг польскіх даследчыкаў (напр., І. Лелявель, Ф. Пекасінскі) яшчэ з XIX ст. памылкова адносілі пачатак працы да мяжы XV і XVI стст. [11, с. 20; 12, с. 161]. Некаторыя нумізматы сцвярджаюць, што мынца пачала дзейнасць у 1492 г. – адразу па ўступленні на вялікакняскі пасад Аляксандра або, нават, раней [13, с. 3-5; 14, с. 78; 15, с. 93-94]. Аднак, намі ў шэрагу ранейшых публікацый пераканаўча была даказана памылковасць такіх думак [16, с. 261-262; 17, с. 56-57].

Зараз жа больш распаўсюджанай думкай з'яўляецца тое, што мынца пачала працу толькі з 1495 г. Адкрыццё манетнага двара і арганізацыя яго бесперабойнага функцыянавання патрабавала вялікай арганізацыйнай працы. На гэта і спатрэбілася

некалькі гадоў пасля ўступлення на пасад Аляксандра. Новы Вялікі князь прыняў дзяржаву ў вельмі неспакойныя часы – працягвалася вайна з Масковіяй, якая скончылася ў 1494 г. падпісаннем “вечнага міру” [18, с. 20].

Да Аляксандра віленская мынца ўжо некалькі дзесяцігоддзяў не дзейнічала. Абсалютна невядома, ці засталіся нейкія меннічыя прылады і абсталяванне. Хутчэй за ўсё, не. Аднаўленне працы мынцы “з нуля” патрабавала велізарных фінансавых магчымасцяў. Вось тут і паўстае пытанне, кім былі і адкуль узяліся людзі, якія працавалі на адноўленым манетным двары ў Вільні?

На сённяшні момант вядома толькі два дакумента, якія маюць непасрэднае дачыненне да працы мынцы: гэта справаздачы Яна Літавора Храптовіча і Міхала Глінскага аб дзейнасці мынцы за перыяды з 1495-1499 [3, с. 338] і 1501-1506 гг. [19, с. 133]. У гэты час яны займалі пасады гаспадарскіх маршалкаў, галоўнай функцыяй якіх было выкананне асабістых даручэнняў Вялікага князя (гаспадара) і кіраванне прыдворнымі службамі. У гэтых дакументах іх не называюць трымальнікамі мынцы. Верагодна, што такая пасада ў той час толькі фарміравалася. Напрыклад, у суседняй Лівоніі ўжо з 1422-1424 гг. было ўведзена новае права, згодня якога, гарадскія саветы маглі прызначаць дзвух трымальнікаў манетнага двара, адзін з якіх абавязкова павінен быць бургамістрам. У ВКЛ гараджане мелі мала правоў, па-гэтаму не былі ўключаны ў кіраўніцтва мынцы [10, с. 13]. Верагодна, і Храптовіч і Глінскі ажыццяўлялі толькі агульнае кіраванне мынцай.

Але, часам, у дакументах згадваюцца людзі, якія маюць непасрэднае дачыненне да дзейнасці манетнага двара. Вакажам меркаванне, што кіраўніцтва мынцай прыехала з Кракава, бо там ўжо паспяхова дзейнічала каралеўсая мынца і частка манетчыкаў, верагодна была акурат адтуль. Заказваць, напрыклад, нямецкіх або чэскіх манетчыкаў у перыяд не надта добрага фінансавага становішча краіны, было б вельмі недальнавідным крокам.

Э. Іванаускас і Р. Дучыс у 2002 г. са спасылкай на архіўны дакумент, вядомы толькі С. Янушонісу, напісалі, што ў 1489 г. згадваецца віленскі грашовы майстра Генрых Шлягер [10, с. 14]. Некаторыя беларускія даследчыкі нават развілі гэтыя дадзеныя, сцвярджаючы, што мынца біла манеты з імем Аляксандра яшчэ пры жыцці яго бацькі Казіміра: у 1489 г. адбылася спроба адкрыцця новага Віленскага манетнага двара [14, с. 78; 15, с. 93-94]. Цікава, што сам дакумент аўтарам невядомы і нідзе не апублікаваны, а яго існаванне падцвярджае толькі сам С. Янушоніс. Такая таямнічасць дазваляе выказаць меркаванне аб нерэальнасці існавання такога дакумента або аб скажэнні звестак

Але само імя Генрыха Шлягера цалкам рэальнае. З 1495 па 1501 і ў 1504 гг. яно неаднаразова сустракаецца ў дакументах справаводства ВКЛ. У дакуменце, датаваным 1495 г., рэвельскія купцы накіроўваюць ліст да некага *Hinrico Flocher monetario in Vilna*, разлічваюць на яго падтрымку і кажуць пра яго, як блізкага чалавека да Вялікага князя. Літоўскі даследчык Лаймонтас Караліус выказаў меркаванне, што тут ідзе размова менавіта аб Генрыху Шлягеру, толькі няправільна была перапісана першая літара. Ў той час прапісная лацінская літара “S” была трошкі нахіленай і вельмі нагадвала “f”. [20, с. 188-189]. Гэтая думка выглядае цалкам слушнай.

Пра даволі блізкія адносіны паміж Аляксандрам і Шлягерам сведчыць цэлы шэраг дакументаў і наданняў. У снежні 1495 г. яго імя Шлякгир згадваецца ў пастанове аб

ковенскім мыце [3, с. 308]. 1 сакавіка 1496 г. Аляксандр аддае минцерю Шлякгеру ў арэнду ковенскае мыта на тры гады за штогадовую плату ў памеры 450 коп грошай [3, с. 241]. У 1500 г. Вялікі князь за верную службу надае *“слузе и мынц*ъару нашому Пиндрыху Шлякгиру” землі ў Ковенскім павеце з правам закладання ставаў і млыноў [21, с. 154], а ў 1501 г. *“слузе и мынцару нашому Гендріху Шлякге*ру” маёнтак з людзьмі ў Берштанскай воласці [22, с. 179-180]. Верагодна, Шлягер быў тэхнічным кіраўніком мынцы – займаў пасаду мынцмайстра, а агульнае кіраванне мынцай заставалася за гаспадарскім маршалкам, бо менавіта Ян Літавор Храптовіч даваў справаздачу аб дзейнасці мынцы ў 1499 г. [19, с. 133].

Польскі даследчык Фрэдэрык Папе піша, што ў асобе Г. Шлягера Вялікі князь знайшоў чалавека, пры дапамозе якога можна ажыццявіць манетную рэформу і выпускаць добрую манету [23, с. 31]. Абсалютна невядома, якім чынам Г. Шлягер здолеў стаць правадыром манетнай рэформы ў ВКЛ.

У 1501 г. апошні раз згадваецца яго імя ў дакументах, датычных тэрыторыі ВКЛ. Гэта звязана з тым, што ён зноў пераехаў у Кракаў, бо пасля смерці Яна Ольбрахта (1501 г.) Аляксандр атрымаў яшчэ і польскую Карону. У Польшчы трэба было ўзнаўляць працу манетнага двара і на гэтую ролю лепшага чалавека, чым Г. Шлягер было не знайсці. 4 кастрычніка 1502 г. пасля працяглых перамоваў была адчынена кракаўская мынца, на чале якой стаў Г. Шлягер [24, с. 125].

Аднак, большасць захаваўшыхся звестак пра Генрыха Шлягера, звязана менавіта з Польшчай [10, с. 15-16]. Ён паходзіў са Швабіі і быў багатым мяшчанінам. У 1479 г. яго імя ўпершыню згадваецца ў мясцовых дакументах [25, с. 69]. У асноўным, ён жыў у Кракаве і нават пазычаў грошы Аляксандру. Калі доўг дасягнуў вялікай сумы ў 754 грыўны, то Кароль 29 красавіка 1502 г. загадаў выплаціць гэтыя грошы манетамі, якія пачнуць біцца ў новаадчыненай каралеўскай мынцы ў Кракаве, якую ён і ўзначаліць [12, с. 210-211; 270-276]. Пры такой пасадзе патрэбны былі памочнікі, якія б арганізоўвалі пастаўкі срэбра на мынцу. На гэтую ролю добра падыйшлі родзічы Шлягера – швагер Ульрых Гозі і муж пляменніцы Генрых Карловіч. Залажыўшы гандлёва-банкірскую кампанію, згаданая троіца хутка павялічвае свае прыбыткі і вышла на першы план у манетнай справе ў Кракаве. Але ўжо ў студзені 1504 г. з-за невядомых нам прычынаў яны пакідаюць свае пасады і пераязджаюць у Вільню. Меннічую кракаўскую адміністрацыю узначальвае Каспр Бэр, у доме якого і месцілася мынца. У Вільні Г. Шлягер становіцца кіраўніком адзінага літоўскага двара [26, с. 323-324] і выступае ў ролі *magistro monetarie lithuanice* [27, с. 76]. Выкажам меркаванне, што Шлягер разам з таварышамі прыехалі да Вільні непасрэдна па запрашэнню Аляксандра, бо ніякіх спрэчак з мясцовай элітай не было і пасады ў іх ніхто не забіраў. На гэтую думку наводзіць тэкст тэстамента, па якому, шмат каму з уплывовых кракавян завяшчаліся грошы згодна апошняй волі Шлягера. Па тэстаменту ён загадаў быць пахаваным у Марыяцкім касцёле ў Кракаве, якому ён завяшчаў шмат грошай; таксама фундаваў вялікі круцыфікс [25, с. 79-84].

Па прыезду, у 1504 г., Шлягер паўторна атрымлівае ад Аляксандра ў арэнду прыбытковае ковенскае мыта за 1800 коп грошай на тры гады. Аднак, 31 снежня 1504 г. паведамляецца пра ўжо нябожчыка Пиндриха Шлякгира і тое, што апошні рэкамендаваў трыманне мыта сваім сябрам – ужо знаёмым нам Генрыху Карловічу і Ульрыху Гозу [28, с. 410-411].

Апошнія трымалі ковенскае мыта ўвесь вызначаны тэрмін [4, с. 195], аднак, у канцы 1506 г. новы вялікі князь Жыгімонт не працягнуў ім арэнду і перадаў мыта Кгрэгелю Кгрэбелю [19, С. 130-131]. Гэта адбылося, верагодна, з-за таго, што гданьскія купцы ў 1506 г. паскардзіліся на ковенскіх мытнікаў Г. Карловіча і У. Гоза, што апошнія бяруць двайное мыта з іх, калі яны прыязджаць у Коўна і калі выязджаюць з Коўна ў Вільню. Апытаўшы папярэдніх мытнікаў, было вынесена рашэнне толькі адзін раз браць мыта з гданьскіх купцоў *"водле давного обычея"* [3, с. 67-68].

Пасля смерці Шлягера ўся яго маёмасць, адышла дзяржаве. Нешта, верагодна, Аляксандр перадаў сваёй жонцы Алене, бо ў 1507 г. узгадваецца Шлякгеровский дворец у Бірштанскай воласці, які Вялікая княгіня Алена перадае *"на вечность"* іншым людзям [22, с. 180-181]. Відаць, гэты палац быў вельмі шыкоўным, бо нават праз 12 год пасля смерці Шлягера ён яшчэ носіць імя свайго першага гаспадара і называецца Шлякгеровским дворцом [22, с. 184-185].

Вышэй згаданыя Г. Карловіч і У. Гозі былі працаўнікамі мынцы ў Вільні хутчэй за ўсё да яе закрыцця ў 1506 г. М. Гумоўскі сцвярджае, што У. Гозі адразу пасля смерці Шлягера "пад вокам князя Глінскага" кіраваў мынцай да канца панавання Аляксандра [26, с. 324]. А ўжо ў наступны перыяд функцыянавання віленскага манетнага двара (з 1509 г.), менавіта Ульрых Гозі займае вышэйшыя пасады ў меннічай адміністрацыі.

Генрых Карловіч ужо ў 1498 г. актыўна дзейнічаў у ВКЛ, узяўшы ў арэнду берасцейскае, дарагіцкае, бельскае і гарадзенскае мыта на тры гады за 1400 коп грошай [3, с. 246-247].

Адзначу, што гэта толькі першая спроба сабраць звесткі аб людзях, якія мелі дачыненне да мынцы ў Вільні і, спадзяюся, што такі дакументальны накірунак нумізматычных даследванняў будзе больш развівацца ў бліжэйшы час.

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ І ЛІТАРАТУРЫ:

Pietkiewicz, K. Polityka w. ks. Litewskiego Aleksandra wobec miast / K. Pietkiewicz // Białostocczyzna. – 2002. – № 1-2. – C. 18-41.

Strasz, K. Aleksander Jagiellończyk w Wilnie i na ziemiach b. W. Ks. Litewskiego / K. Strasz. – Wilno, 1935. – 31 s.

Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 6 (1494–1506). Užrašymų knyga 6 / Parengė A. Baliulis. –Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidykla, 2001. – 506 p.

Акты Литовской метрики. Т. 1. Вып. 2 (1499–1507) / сост. Ф. И. Леонтович. – Варшава: Типография Варш. Учебн. Округа, 1897. – 201 с.

АВАК. Т. VII: Акты Гродненского гродского суда. – Вильна: Типография А. Г. Сыркина, 1874. – 616 с.

Собрание государственных и частных актов, касающихся истории Литвы и соединённых с ней владений (от 1387 до 1710 года). Ч. 1 / под ред. М. Круповича. – Вильно: Тип. О. Завадского, 1858. – VIII, 164 с.

Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 7 (1506–1539). Užrašymų knyga 7 / parengė I. Ilarienė, L. Karalius, D. Antanavičius. Vilnius: Lietuvos istorijos instituto leidykla, 2011. – XXX, 1012 p.

Крачковский, Ю. Старая Вильна до конца XVII столетия / Ю. Ф. Крачковский. – Вильна, 1893. – 207 с.

Громыко, А. Литовские монеты Александра Казимировича: классификация и периодизация / А. Громыко // Калекцыйная спадчына Вялікага княства. – Мінск: Логвінаў, 2008. – С. 117-132.

Ivanauskas, E., Douchis, R. J. Lietuvos monetų kalybos istorija 1495–1769 / E. Ivanauskas, R. J. Douchis. – Vilnius: Savastis, 2002. – 312 p.

Lelewel, J. O monecie polskiej / J. Lelewel. – Poznań, 1862. – 53 s.

Piekosiński, F. O monecie i stopie menniczéj w Polsce w XIV i XV wieku / F. Piekosiński // Rozprawy i Sprawozdania z Posiedzeń Wydz. Hist.-Filozof. Akad. Umiejęt. w Krakowie. – 1878. – T. IX. – S. 1-320.

Gumowski, M. Mennica wileńska w XVI i XVII w. / M. Gumowski. – Warszawa, 1921. – 200 s.

Гулецкі Д., Грамыка А., Крываручка А. Манеты Беларусі (да 1707 г.) / Д. Гулецкі, А. Грамыка, А. Крываручка. – Мінск: І. П. Логвінаў, 2007. – 216 с.

Гулецкі, Дз. Манеты беларускай даўніны / Дз. Гулецкі. – Мінск: Беларусь, 2007. – 159 с.

Карач, А. В. Документы и нумизматика ВКЛ (конец XV – первая половина XVI века): ошибки исследователей / А. В. Карач // Русь. Литва. Орда в памятниках нумизматики и сфрагистики: сборник научных статей. – 2015. – Вып. 1. – С. 260-263.

Карач, А. Про початок діяльності Вільнюського монетного двору в часи Олександра Ягеллончіка (1495–1506 рр.) / А. Карач // Львівські нумізматичні записки. – 2014-2015. – № 11-12. – С. 56-57.

Карач, А. Аб некаторых спрэчных пытаннях грашовай сістэмы ВКЛ падчас праўлення Александра Ягелончыка (1492–1506 гг.) / А. Карач // Материалы междунар. нумизмат. конф.: “Сохраняя прошлое – строим будущее”, Минск, 5–6 окт. 2017 г. Часть I / Нац. банк Респуб. Беларусь. – Банкаўскі веснік. – 2017. – N 12 [653]. – С. 19–22.

Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 8 (1499–1514). Užrašymų knyga 8 / parengė A. Baliulis, R. Firkovičius, D. Antanavičius. – Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidykla, 1995. – 709 p.

Karalius, L. Kauno muitininkas Henrikas Sliacheris (1496–1499, 1504) / L. Karalius // Kauno istorijos metraštis. – 2002. – T. 3. – S. 185-201.

Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 5 (1427–1506). Užrašymų knyga 5 / parengė A. Baliulis, A. Dubonis, D. Antanavičius. – Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidykla, 1993. – 516 p.

Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 25 (1387–1546).Užrašymų knyga 25 / parengė D. Antanavičius, A. Baliulis. – Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidybos institutas, 1998. – 461 p.

Papée, F. Aleksander Jagiellończyk / F. Papée. – Kraków: Polska Akademia Umiejętności, 1949. – 120 s.

Gumowski, M. Mennica koronna za Aleksandra Jagiellończyka / M. Gumowski // Wiadomości Numizmatyczno-Archeologiczne. – 1909. – № 7. – S. 125-127.

Walanus, W. Henryk Slacker – fundator kamiennego krucyfiksu w kościele Mariackim / W. Walanus // Folia Historiae Artium. Seria Nowa. – 2009. – T. 12. – S. 67-86.

Gumowski, M. Ulryk Hozjusz, ojciec kardynała, horodniczy wileński / M. Gumowski // Przegląd powszechny. – 1926. – T. 171. – S. 321-329.

Teki A. Pawińskiego T. I: Liber Quitantiarum Alexandri Regis ab a. 1502 ad 1506. (Księga skarbowa króla Aleksandra Jag.) / wyd. A. Pawiński. – Warszawa: Księgarnia Gebethnera i Wolffa, 1897. – 221 s.

Акты, относящиеся к истории Западной России. Т. 1 (6). Сборник документов канцелярии Великого князя Литовского Александра Ягеллончика (1494–1506) / отв. Ред. С. М. Каштанов. – М., СПб.: Нестор-История, 2012. – 664 с.

Employees of the Vilnius Mint in the time of Alexander (1492-1506)
Abstract

Based on a wide range of sources, this article for the first time attempts bringing together all the information about people related to the activities of the mint in Vilnius during the reign of Alexander Jagiellon (1492-1506). By tracкing the constant movements of coin makers, the author showed the relationship between the Krakow and Vilnius coin houses. With very little information available, this is only the first step in the research on this issue, which will hopefully! Lead to more active archival searches in this direction.

Keywords : mint, document, Heinrich Schlager, Vilnius, halfgroat

SPIS TREŚCI:

Василь Орлик (Україна)
ЗНАХІДКА КИЗІКІНА-ГЕКТИ В СЕРЕДИНІ 90-Х РОКІВ XX СТ.
ПОБЛИЗУ С. ПАРУТИНЕ 5

Андрэй Карач (Беларсуь)
ПРАЦАЎНІКІ ВІЛЕНСКАГА МАНЕТНАГА ДВАРА
Ў ЧАСЫ АЛЯКСАНДРА (1492-1506) 16

Крыцук Роман (Беларусь)
НАХОДКА МОНЕТНОЙ ПЛАСТИНЫ ВИЛЕНСКОЙ МЕННИЦЫ 1652 Г.
В БЕЛАРУСИ 22

Віктор Коцур Надія Коцур (Україна)
СУЧАСНІ АНТИКВАРНІ ПІДРОБКИ
МОСКОВСЬКИХ ЄФІМКІВ З ОЗНАКАМИ 29

Дмитрий Матеша (Беларусь)
К ВОПРОСУ ОБ АТРИБУЦИИ ЛИЧМАНА ОСТАФИЯ ВОЛОВИЧА 37

Виктор Какареко (Беларусь)
КОРОННЫЕ ЗЛОТЫЕ В КЛАДАХ
НА ТЕРРИТОРИИ ГРОДНЕНСКОЙ ОБЛАСТИ 43

Tomasz Zawistowski (Polska)
MONETY Z ZESŁANIA 63

Оксана Шпортун Андрій Табачук (Україна)
ЗЛОВЖИВАННЯ СЛУЖБОВИМ СТАНОВИЩЕМ ЧИНОВНИКІВ
НАДДНІПРЯНСЬКОЇ УКРАЇНИ К. XVIII – ПОЧ. XX СТ. 69

Switłana Orłyk (Ukraina)
ZNAKI I ŻETONY STOWARZYSZENIA POMOCY
OFIAROM PIERWSZEJ WOJNY ŚWIATOWEJ 79

Joanna Lipinin (Polska)
ZWYKŁY CZŁOWIEK W KRYZYSIE FINANSOWYM 1918-1920 85

Juliusz Bieniaś (Polska)
PIENIĄDZE SYBERYJSKIE ADMIRAŁA KOŁCZAKA 95

Maciej Karczewski (Polska)
KOLEKCJE NUMIZMATYCZNE
WSCHODNIOPRUSKICH HEIMATMUSEEN 115

Zbyšek Šustek (Słowacja)
KWESTIA WPROWADZENIA WALUTY FRANKOWEJ
W CZECHOSŁOWACJI W LATACH 1918-1925 129

Witold Garbaczewski (Polska)
POLSKI ZŁOTY W ZWIERCIADLE ILUSTRACJI PRASOWEJ
(OKRES DWUDZIESTOLECIA MIĘDZYWOJENNEGO) 150

Krzysztof Filipow (Polska)
BONY POLSKICH OBOZÓW JENIECKICH
W CZASIE WOJNY (1939-1945) 173

Елена Жарина (Беларусь)
ЗОЛОТЫЕ МОНЕТЫ В КЛАДАХ, НАЙДЕННЫХ
НА ТЕРРИТОРИИ ЕВРЕЙСКИХ ГЕТТО В ГРОДНО 184

Андрій Бойко-Гагарін (Україна)
ТОГОЧАСНІ ПІДРОБКИ МОНЕТ ТА БАНКНОТ РОСІЙСЬКОЇ ІМПЕРІЇ
У ПРОДАЖАХ НА НУМІЗМАТИЧНИХ АУКЦІОНАХ 195